***ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ***

# БІБЛІЯГРАФАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАКУМЕНТАЎ

**1-23 01 11 – Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)**

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

Курс 4 (436 гр.)

Семестр IV

Лекцыі 14

Практычныя (семінарскія)
заняткі 40

Экзамен IV

Курсавая работа (праект)

Аўдыторных гадзін па
вучэбнай дысцыпліне 54

Усяго гадзін па
вучэбнай дысцыпліне 126

Форма атрымання
вышэйшай адукацыі дзённая, завочная

Склала Валянціна Іванаўна Саітава, кандыдат педагагічных навук. дацэнт

Вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове вучэбнай праграмы “Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў” 08.01.2011 №ТД-Е 2871
Разгледжана і рэкамендована да зацвярджэння кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый
(пратакол № 2 ад 23.09.2015 г.)

Загадчык кафедры

__________В.А. Касап

Мінск
2015

Репозиторий БГУКИ

## ЗМЕСТ

Рабочая праграма і тэмплан

Метадычныя ўказанні да практычных заняткаў

Метадычныя ўказанні для самастойнай работы студэнтаў

Графік кантролю за самастойнай работай студэнтаў

Умовы выкарыстання рэйтынгавай сістэмы

Тэмы курсавых і дыпломных работ

Тэмы дыпломных і магістарскіх работ

Спіс літаратуры

Пытанні заданні да заліку

Выкарыстанне тэхнічных сродкаў

Метадычныя матэрыялы для ФЗН

Репозиторий БГУКИ

**Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў**

**Рабочая праграма на 2015-2016 навучальны год**

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Згодна вучэбнага плана дысцыпліна “Бібліяграфаванне краязнаўчай літаратуры” вывучаецца студэнтамі IV курса ФІДК і V курса ФЗН спецыялізацыі “бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства”.

Мэтай дысцыпліны з'яўляецца вывучэння перадавой тэхналогіі і методыкі працэса бібліяграфавання краязнаўчай літаратуры. Актуальнасць дысцыпліны абумоўлена значным узрастаннем дзейнасці бібліятэк розных тыпаў па падрыхтоўцы разнастайнай краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі як з прымяненнем традыцыйнай, так і на аснове аўтаматызаванай тэхналогіі. Падрыхтоўка краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, з аднаго боку, заснавана на агульнай методыцы і тэхналогіі вытворчасці дакументаванай інфармацыйнай прадукцыі, з другога – існуюць уласцівыя толькі гэтым дапаможнікам задачы, мэты, метады стварэння.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны вызначае кола задач, накіраваных на фарміраванне у студэнтаў адпаведных ведаў і уменняў.

*У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:*

- Тэарэтыка-метадычнымі асновы бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў
- Асноўныя тэхналагічныя этапы падрыхтоўкі краязнаўчых дапаможнікаў;
- Асноўныя тэхналагічныя працэсы кожнага з этапаў;
- Метадычныя асаблівасці стварэння краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў асобных відаў, тыпаў і жанраў;
- Традыцыйную і аўтаматызаваную тэхналогію падрыхтоўкі краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка любога віда, тыпа, жанра.

*умець:*

- Ствараць бібліяграфічныя апісанні краязнаўчай літаратуры розных відаў, у т.л. апісанні па форме “Са зместу”;
- Ствараць анатацыі розных відаў з улікам спецыфічных патрабаванняў;
- Складаць бібліяграфічныя дапаможнікі розных відаў, тыпаў, жанраў;
- Аналізаваць метадычную якасць краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Репозиторий БГУКИ

Для вывучэння данай дысцыпліны неабходна засваенне наступных курсаў: “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства”, “Краязнаўчае крыніцазнаўства”, “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы”.

Асноўныя віды заняткаў па дысцыпліне: лекцыі, семінары, практычныя работы. Паводле графіку выконваецца і кантралюецца самастойная работа студэнтаў. Змест самастойнай работы накіраваны на паглыбленне тэарэтыка-метадычных ведаў бібліяграфавання краязнаўчай літаратуры, засваення тэхналагічных уменняў, выпрацоўкі ацэначнага (крытычнага) прафесійнага мыслення, неабходнага для кіравання якасцю бібліяграфічнай прадукцыі. Пераважнай формай праверкі самастойнай работы з'яўляюцца тэсты; студэнты выконваюць практычныя заданні ў розных тэхналагічных рэжымах, рыхтуюць рэцэнзіі на краязнаўчыя дапаможнікі, метадычны семінар (дзелавую гульню) па пытаннях ўдасканалення краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Вывучэнне курса завяршаецца экзаменам на дзённым аддзяленні і залікам на завочным.

Репозиторий БГУКИ

## Уводзіны

Мэты, задачы вучэбнай дысцыпліны “Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў”, яго значэнне для падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай галіны. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнанавуковага і прафесійнага цыклаў. Забеспячэнне вучэбнымі, метадычнымі, нарматыўнымі і іншымі матэрыяламі і літаратурай.

Структура вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя формы аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

## Раздзел 1. Асобныя тэхналагічныя працэсы і аперацыі падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

### Тэма 1. Фіксаваныя краязнаўчыя веды як аб’ект бібліяграфавання

Бібліяграфаванне розных носьбітаў ведаў і інфармацыі, форм памяці – характэрная асаблівасць падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі на сучасным этапе.

Значэнне вусных матэрыялаў (“мемаратаў”), фіксаванне іх у працэсе стварэння краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

Відавы састаў друкаваных дакументаў, якія пераважаюць у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках на сучасным этапе. Перавага публікацый з мясцовага перыядычнага друку ў бягучых бібліяграфічных паказальніках. Характарыстыка газетных жанраў, ацэначны падыход да адбору асобных публікацый. Павышэнне значэння бібліяграфавання неапублікаваных матэрыялаў, архіўных дакументаў, аўдыё-відэа матэрыялаў.

Выкарыстанне ведаў і інфармацыі прадстаўленых на электронных носьбітах у працэсе падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

### Тэма 2. Асаблівасці падрыхтоўчага і аналітычнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

Патрабаванні да выбару тэмы краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка і абмежаванні тэрытарыяльных межаў мясцовасці. Асноўныя крыніцы выяўлення краязнаўчых дакументаў. Мэтавае і чытацкае прызначэнне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў.

Асноўныя патрабаванні да бібліяграфічнага апісання краязнаўчых дакументаў; выкарыстанне дзеючых стандартаў і правіл бібліяграфічнага апісання пры стварэнні краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Раскрыццё краязнаўчы зместу дакументаў з прымяненнем формы бібліяграфічнага апісання “Са зместу:”.

Рэпазіторый БДУКМ

Асаблівасці бібліяграфічных апісанняў дакументаў лацінскага шрыфта ў латэнтных краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялах XVIII ст.; улік тагачасных умоўных абазначэнняў і пунктуацыі пры пераўтварэнні структуры бібліяграфічных апісанняў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Віды анатацый па розных прыметах, прымяняемыя ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках. Этапы падрыхтоўкі анатацый, структура анатацый розных відаў. Спецыфічныя элементы анатацый на краязнаўчыя дакументы. Асаблівасці анатавання літаратуры розных відаў (навуковай, даведачнай, мастацкай і інш.) пры падрыхтоўцы краязнаўчых дапаможнікаў. Асноўныя навуковыя публікацыі і метадычныя рэкамендацыі па анатаванні краязнаўчай літаратуры (М.В.Здобнава, А.В.Мамантава, РНБ, НББ і інш.). Анатаванне электронных рэсурсаў, адлюстраваных у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.

### Тэма 3. Асаблівасці сінтэтычнага і заключнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

Характарыстыка тэхналагічных працэсаў сінтэтычнага этапу: адбору дакументаў, групоўкі бібліяграфічных запісаў, састаўлення дапаможных паказальнікаў. Патрабаванні да адбору новых публікацый з газет і рэтраспектыўнага адбору матэрыялаў з перыядычных выданняў. Характарыстыка груповак бібліяграфічных запісаў; адаптацыя структуры “Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь” у дапаможніках асобных тыпаў.

Прызначэнне дапаможных паказальнікаў для аптымізацыі пошукавых магчымасцей сістэме краязнаўчых бібліяграфічных ведаў, адлюстраваных у бібліяграфічным дапаможніку. Склад дапаможных паказальнікаў, якія атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Залежнасць выбару дапаможных паказальнікаў ад від-тыпалагічных і жанравых асаблівасцей бібліяграфічных дапаможнікаў.

Методыка падрыхтоўкі імянных і персанальных дапаможных паказальнікаў. Састаў імянных і персанальных рубрык. Пашырэнне іх інфарматыўнасці за лік уключэння фактычных даных.

Методыка падрыхтоўкі геаграфічных дапаможных паказальнікаў. Састаў геаграфічных рубрык, уключэнне тэматычных, храналагічных і іншых падрубрык у складаныя геаграфічныя рубрыкі. Абазначэнне статуса геаграфічных аб’ектаў з дапамогай умоўных скарачэнняў.

Репозиторий БГУКИ

Методыка падрыхтоўкі паказальнікаў устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый.

Значэнне і прымяненне спасылак у дапаможных паказальніках розных відаў.

Асноўныя тэхналагічныя працэсы заключнага этапа: падрыхтоўка даведачна-пошукавага апарату, рэдагаванне дапаможніка, падрыхтоўка дапаможніка да друку. Патрабаванні да прадмоў, уводных тэкстаў. Спісы прагледжаных крыніц. Віды рэдагавання краязнаўчых дапаможнікаў. Удзел краязнаўцаў, вучоных і спецыялістаў у навуковым рэдагаванні. Афармленне розных форм краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Значэнне рэдагавання для ўдасканалення падрыхтаваных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, яго віды. Задачы навуковага рэдагавання, выкарыстанне мясцовых краязнаўцаў, даследчыкаў і спецыялістаў у якасці навуковых рэдактараў. Змест кансультацый навуковых рэдактараў на асобных тэхналагічных этапах падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Задачы літаратурнага рэдагавання. Моўна-стылістычныя патрабаванні да краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў і жанраў.

Задачы бібліяграфічнага рэдагавання. Тыповыя памылкі, якія выпраўляюцца падчас бібліяграфічнага рэдагавання.

## Раздзел 2. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў асобных відаў, тыпаў і жанраў

### Тэма 4. Методыка падрыхтоўкі рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

Мэтавае і чытацкае прызначэнне рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, іх асноўныя тыпы і жанры. Метадычная характарыстыка універсальных і комплексных рэтраспектыўных дапаможнікаў тыпа “Што чытаць аб краі” (“Край: мінулае і сучаснасць”), галіновых, тэматычных, персанальных (біябібліяграфічных), каляндароў знамянальных і памятных дат. Метадычная характарыстыка асобных тыпаў і жанраў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў: папулярнай краязнаўчай энцыклапедыі, бібліяграфічнага нарыса, даведніка, хронікі і інш. Вырашэнне пытанняў межаў тэрыторыі, адбору і бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў, суадносін бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, структуры дапаможнікаў, групоўкі бібліяграфічных запісаў, складу даведачна-метадычнага апарату, ілюстрацый і інш.

Репозиторий БГУКИ

Выкарыстанне праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў у электронным рэжыме.

## Тэма 5. Методыка падрыхтоўкі навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

Мэтавае і чытацкае прызначэнне навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Тэхналогія падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў краязнаўчых навукова-дапаможных паказальнікаў: універсальных бягучых і рэтраспектыўных, галіновых, тэматычных, персанальных/біябібліяграфічных, прац устаноў рэгіёна) і аглядаў розных відаў, паказальнікаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Абгрунтаванне выбару віда, тыпа і жанра дапаможніка. Вызначэнне мэтавага і чытацкага адраса, межаў тэрыторыі, структуры дапаможнікаў, кола крыніц выяўлення дакументаў, крытэрыяў адбору і спосабаў бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў, падбор ілюстрацыйнага матэрыялу і іншыя прыватныя метадычныя рашэнні.

Выкарыстанне праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў у электронным рэжыме.

## Тэма 6. Методыка падрыхтоўкі дапаможнікаў мясцовых выданняў

Мэтавае і чытацкае прызначэнне дапаможнікаў мясцовых выданняў, іх асноўныя тыпы. Метадычная характарыстыка паказальнікаў мясцовых кніг (асобных выданняў) і перыядычнага друку. Вызначэнне межаў тэрыторыі, структуры дапаможнікаў, кола крыніц выяўлення мясцовых выданняў, крытэрыяў адбору і спосабаў бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў, іншых прыватных метадычных рашэнняў.

Выкарыстанне праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы дапаможнікаў мясцовага друку ў электронным рэжыме.

Репозиторий БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ СЕМІНАРАЎ

### Тэматыка семінараў

Семінарскія заняткі з'яўляюцца вынікам самастойнай работы па вывучэнні асноўнай і дадатковай літаратуры па прапанаваных ніжэй тэмах семінарскіх заняткаў. Семінарскія заняткі садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню і засваенню самых складаных і значных тэм курса.

На семінары студэнты павінны паказаць дастаткова глыбокае веданне матэрыялу тэмы, уменні аналізаваць гэты матэрыял, самастойна разважаць і рабіць тэарэтычныя і практычныя вывады па вызначанай тэме.

У падрыхтоўку да семінарскага занятку ўваходзіць вывучэнне рэкамендуемай літаратуры, канспектаванне, складанне разгорнутых адказаў па кожным пытанні. Неабходна прачытаць асноўную і дадатковую літаратуру, зрабіць выпіскі і падрыхтаваць кароткі або разгорнуты (па жаданні студэнта) пісьмовы адказ на кожнае пытанне семінара. Гэтымі запісамі студэнт можа карыстацца пры адказах на семінарскіх занятках.

Існуюць наступныя патрабаванні да выступлення студэнта: добрае валоданне вывучаным матэрыялам; уменне звязаць яго з адпаведным напрамкам дзейнасці бібліятэк; лагічнасць і паслядоўнасць у адказе; выдзяленне найбольш важных палажэнняў і ўменне зрабіць вывады па кожным пытанні семінара. Дадатковыя балы набіраюць студэнты, якія дапаўняюць выступленні, выказваюць крытычныя і ацэначныя меркаванні, вядуць дыскусію, рыхтуюць невялікія прэзентацыі па тэматыцы семінараў.

Репозиторий БГУКИ

## СЕМІНАР № 1
## па тэме “АСАБЛІВАСЦІ ТЭХНАЛАГІЧНЫХ ЭТАПАЎ ПАДРЫХТОЎКІ ПАДРЫХТОЎКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ”, 2 гадзіны

Пытанні:

1. Аб’екты бібліяграфавання ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.
2. Асаблівасці падрыхтоўчага этапа.
3. Асаблівасці аналітычнага этапа:

   3.1. патрабаванні да бібліяграфічнага апісання краязнаўчых дакументаў.

   3.2. Спецыфічныя асаблівасці анатавання краязнаўчых дакументаў.

   3.3. Асаблівасці анатавання літаратуры розных відаў пры падрыхтоўцы краязнаўчых дапаможнікаў асобных жанраў.
4. Асаблівасці сінтэтычнага этапа.

   4.1. Віды бібліяграфічнага адбору і груповак бібліяграфічных запісаў у краязнаўчых дапаможніках розных тыпаў і жанраў.

   4.2. Падрыхтоўка дапаможных паказальнікаў розных відаў ў працэсе традыцыйнай і аўтаматызаванай тэхналогіі.
5. Асаблівасці заключнага этапа.
6. Выступленні студэнтаў з паведамленнямі аб станоўчым і недахопах у методыцы складання дапаможнікаў на падставе вынікаў СРС № 2.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. Бавин, С.П. Библиографическая запись в рекомендательном указателе / С.П. Бавин // Библиография. – 2010. – № 6. – С.35 – 44.
2. Ефремова, Е.Н. Типология архивных источников в библиотечном краеведении / Е.Н. Ефремова // Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск, 2013. – С.108-113.
3. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / НББ. – Мінск, 1994. – С.45 – 47.
4. Мамонтов, А.В. Аннотирование литературы в универсальных краеведческих библиографических пособиях / А.В.Мамонтов // Советская библиография. – 1980 – № 6. – С.18 – 27.
5. Мамонтов, А.В. Краеведческая библиография : учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М., 1989. – С.138 – 140.


Репозиторий БГУКИ

6. Саітава, В.І. Фотадакументы як аб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В.І.Саітава // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск. 24 – 26 мая 2005 г.): матэрыялы чытанняў. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – С.121 – 127.
7. Стрыжонак, І.М. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства : тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
8. Шатохина, Н. З. Оптимальная модель построения краеведческих библиографических ресурсов / Н. З. Шатохина // Труды международного библиографического конгресса. – 2012. – Ч. 1. – С. 310-317

*Дадатковая*

1. Библиотечное краеведение : терминологический словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.
2. Ползик, В.П. Памятные книжки Витебской губернии на 1861-1914 гг. как основа регионального библиотечного краеведения XIX в. / Ползик В.П. // Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск, 2013. – С.128-138.

Репозиторий БГУКИ

## СЕМІНАР № 2

## па тэме "МЕТАДЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫХ (ПАПУЛЯРНЫХ) КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ", 2 гадзіны

### Пытанні

1. Відавыя асаблівасці рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
2. Жанрава-тыпалагічны склад рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
3. Метадычныя асаблівасці агульных паказальнікаў аб краі, календароў знамянальных і памятных дат, бібліяграфічных хронік, краязнаўчых энцыклапедый, нарысаў і іншых жанраў (тыпаў) дапаможнікаў.
4. Жанрава-тыпалагічны склад навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
5. Метадычныя асаблівасці бягучых навукова-дапаможных паказальнікаў аб краі, агульных рэтраспектыўных паказальнікаў, галіновых, тэматычных, персанальных (біябібліяграфічных) дапаможнікаў.

*ЛІТАРАТУРА*

Асноўная


1. Акимбетова, А.Г. Краеведческая библиографическая деятельность библиотек на современном этапе / А.Г. Акимбетова // Новая библиотека. – 2008. – № 6. – С.33 – 36.
2. Бавин, С.П. Рекомендательная библиография : состояние и перспективы / С.П. Бавин // Труды Международного библиографического конгресса. (Санкт-Петербург, 21–23 сент. 2010 г.). – Санкт-Петербург : Рос. нац. б-ка, 2012. Ч. I. – С. 447–454.
3. Библиотечное краеведение: терминологический словарь / сост. В.В. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998 – 85 с.
4. Головко, С.И. Проектная модель путеводителя : рекомендательное пособие / С.И. Головко // Мир библиографии. – 2009. – N 4. –С. 30–35. – Библиогр.: с. 35 (10 назв. ).
5. Денисенко, С.А. Характеристика основных групп пользователей информационных продуктов и услуг в сфере краеведения / С.А.Денисенко


Репозиторий БГУКИ

// Библиотечное дело – 2000: проблемы формирования открытого информационного общества : тезисы докл. – М., 2000. – Ч.1. – С.71 – 72.
6. Краеведческие указатели и БД // Справочник библиографа. – 4–е изд., прераб. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – С.552 – 565.
7. Мамонтов, А.В. Краеведческая библиография : учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М.: Кн. палата, 1989. – С.148 – 161.
8. Саітава, В.І. Персанальная краязнаўчая бібліяграфія / В.І.Саітава // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С.122 – 128.
9. Составление краеведческих рекомендательных библиографических пособий типа “Календарь знаменательных и памятных дат”: метод. рек. / ГПБ; сост. Г.М.Вольберг. – Л., 1989. – 29 с.
10. Составление универсальных рекомендательных пособий о крае : метод. рек. / ГПБ; сост. Г.М.Вольберг. – Л., 1988. – 46 с.
11. Составление универсальных текущих указателей краеведческой литературы : метод. рек. / ГПБ ; сост. Г.М. Вольберг. – Л., 1982. – 29 с.
12. Стрыжонак, І.М. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
13. Тараненко, Л.Г. Информационное обеспечение региона: специфика краеведческой деятельности библиотек / Л.Г.Тараненко. – М.: Литера, 2009. – 160 с.

*Дадатковая*

1. *Левин, А.М.* Календарь памятных дат с Web-доступом / А.М.Левин // М. : ГПНТБ России, 2009. – 41 с.
2. *Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі / НББ; склад. Р.М. Чыгірава, М.У. Сокал. – Мн., 1994. – С. 61 – 64.
3. *Пронина, Л.А.* Электронные коллекции краеведческих информационных ресурсов: библиоэкологические аспекты / Л.А.Пронина, Н.Е.Копытова, Н.В.Шаталова, А.Н.Евстигнеев, В.В.Дубенский // Вопросы библиографоведения. Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий. – М.: Пашков дом, 2007. – Вып. 16. – С.76 – 83.
4. *Рекомендательная* библиография и библиотечная практика: [сб.ст.] / [сост., науч. ред. С.П. Бавин]. – М. : Пашков дом, 2007. – 168 с.

Репозиторий БГУКИ

5. *Толкунова, В.* Современные библиографические краеведческие издания как средство обеспечения доступа к краеведческой информации / В. Толкунова // Инф. бюл. РБА. – 2003. – № 24. – С. 176 – 178.
6. *Щерба, Н.Н.* Система краеведческих библиографических пособий научно-вспомогательного характера на современном этапе: лекция / МГИК. – М., 1975. – 51 с.

Репозиторий БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА № 1
### па тэме “ПАДРЫХТОЎКА АГУЛЬНАГА РЭКАМЕНДАЦЫЙНАГА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ПАКАЗАЛЬНІКА АБ КРАІ”, 18 гадзін

*Мэта:* Авалоданне методыкай падрыхтоўкі агульнага рэкамендацыйнага бібліяграфічнага паказальніка аб краі.

*Выкананне:* Кожны студэнт рыхтуе агульны рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік аб краі. Выбар тэрыторыі ўзгадняецца з выкладчыкам. Распрацоўваецца праспект будучага дапаможніка, самастойна вядзецца выяўленне розных відаў дакументаў на аснове вызначанага кола крыніц. Абгрунтоўваюцца крытэрыі адбору дакументаў і групоўкі бібліяграфічных запісаў, якія падначалены мэтам цэннаснай арыентацыі ў лепшай краязнаўчай літаратуры. Мінімальная колькасць дакументаў – 50 назваў, 80% бібліяграфічных запісаў павінны ўключаць рэкамендацыйныя анатацыі. Рыхтуюцца элементы даведачна-метадычнага аснашчэння паказальніка, ілюстрацыйныя матэрыялы.

Размеркаванне гадзін – падрыхтоўка праспекта паказальніка – 3 гадзіны (самастойная работа); устанаўленне кола крыніц выяўлення дакументаў, праца з першаснымі і другаснымі крыніцамі выяўлення дакументаў, вядзенне рабочай картатэкі – 4 гадзіны; агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў, іх адбор, анатаванне, складанне бібліяграфічных запісаў іх увод – 6 гадзін; удакладненне структуры паказальніка, групоўка бібліяграфічных запісаў, рэдагаванне дапаможных паказальнікаў, падрыхтоўка прадмовы, канчатковае рэдагаванне і афармленне дапаможніка – 4 гадзіны. Для падрыхтоўкі дапаможніка выкарыстоўваецца праграмнае забеспячэнне камп’ютарных класаў.

Абмеркаванне метадычных пытанняў і якасці падрыхтаваных дапаможнікаў вядзецца на семінары № 2.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М. : Кн. палата, 1989. – С.96 – 101, 148 – 155.
2. *Михлина, И.И.* Отбор литературы по территориальному признаку в краеведческих пособиях / И.И. Михлина // Библиография. – 1998. – № 1. – С.35 – 39.
3. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

Репозиторий БГУКИ

**ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА № 2**
**па тэме “ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВА-ДАПАМОЖНАГА БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНАГА СЛОЎНІКА”, 18 гадзін**

*Мэта:* Авалоданне методыкай падрыхтоўкі персанальных паказальнікаў ураджэнцаў і дзеячоў края.

*Выкананне:* Кожны студэнт рыхтуе дапаможнік па вызначанаму краю (населенаму пункту). Выбар тэрыторыі ўзгадняецца з выкладчыкам. Распрацоўваецца праспект будучага дапаможніка, у якім вызначаюцца крыніцы і крытэрыі выяўлення і адбора персаналій, крыніцы выяўлення матэрыялаў аб іх. Складаюцца ўніфікаваныя мадэлі персанальных глаў, якія будуць выкарыстаны ў слоўніку. Абгрунтоўваюцца крытэрыі адбору дакументаў і групоўкі бібліяграфічных запісаў, якія падначалены мэтам магчыма поўнага адлюстравання сувязей “асоба – край”. Мінімальная колькасць персаналій – 20, павінны быць прадстаўлены як ураджэнцы, так і дзеячы края. Персаналіі могуць быць абмежаваныя храналагічным перыядам, родам дзейнасці, саслоўнай прыналежнасцю ці інш. Рыхтуюцца элементы даведачна-метадычнага аснашчэння паказальніка, ілюстрацыйныя матэрыялы.

Размеркаванне гадзін – падрыхтоўчы этап – 2 гадзіны і самастойная работа № 3; устанаўленне кола крыніц выяўлення дакументаў, праца з першаснымі і другаснымі крыніцамі выяўлення персаналій і дакументаў, вядзенне рабочай картатэкі – 4 гадзіны; агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў, іх адбор, падрыхтоўка біяграфічных даведак, складанне персанальных глаў, бібліяграфічных спісаў – 8 гадзін; канчатковае рэдагаванне і афармленне дапаможніка – 4 гадзіны.

Для падрыхтоўкі дапаможніка выкарыстоўваецца праграмнае забеспячэнне камп’ютарных класаў.

Абмеркаванне метадычных пытанняў і якасці падрыхтаваных дапаможнікаў вядзецца на семінары № 3.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М. : Кн. палата, 1989. – С.96 – 101, 127– 128.
2. *Михлина, И.И.* Отбор литературы по территориальному признаку в краеведческих пособиях / И.И. Михлина // Библиография. – 1998. – № 1. – С.35 – 39.


Репозиторий БГУКИ

3. *Подготовка* краеведческих материалов по персоналиям: метод. рекомендации / Рос. гос. б-ка для слепых; сост. Н.Д. Шапошникова. – М., 2001. – 14 с.
4. *Саітава, В.І.* Персанальная краязнаўчая бібліяграфія / В.І.Саітава // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С.122 – 128.
5. *Саітава, В.І.* Фотадакументы як аб’ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В.І.Саітава // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск. 24 – 26 мая 2005 г.): матэрыялы чытанняў. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – С.121 – 127.
6. *Соболева, А.* Персональный указатель: теория и методика / А.Соболева // Мир библиогр. – 2001. – № 4. – С.23 – 26.
7. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

*Дадатковая*

1. *Пушкін, І.* "Выпускнікі і навучэнцы Магілёўскай мужчынскай гімназіі": паказальнік літ. / І.Пушкін // Магілёўс. ведамасці. – 8 ліп. – С.4.

Репозиторий БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа дапамагае арганізаваць раўнамерную дзейнасць студэнтаў па вывучэнні прадмета, больш глыбока і грунтоўна засвоіць яго, дасягнуць своечасовага выканання заданняў, сачыць за індывідуальным рэйтынгам.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на заданні, якія выконваюцца ў камп'ютарных класах і бібліятэках. Яны могуць мець індывідуальны характар і больш высокі ўзровень складанасці, што знойдзе адпаведнае адлюстраванне і ў сістэме ацэнак.

Глыбей засвоіць метадычныя і тэхналагічныя пытанні падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі дапаможа і тэсціраванне. Тэсты змяшчаюць заданні featureзнага ўзроўню складанасці і ахопліваюць заданні адкрытай і закрытай формаў, заданні на ўстанаўленне адпаведнасцей і правільнай паслядоўнасці.

### Тэма 1. АБ'ЕКТЫ БІБЛІЯГРАФАВАННЯ, АСАБЛІВАСЦІ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ І АНАТАВАННЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАКУМЕНТАЎ, 14 гадзін

**Заданне для СРС** – на аснове прапанаванай літаратуры падрыхтавацца да тэсціравання.

*1. Дапоўніце пералік носьбітаў ведаў і інфармацыі, якія бібліяграфуюцца ў краязнаўчых дапаможніках:*

1.1. мемараты

1.2. электронныя дакументы

1.3__________________________

*2. У кнігах лацінскага шрыфта XVIII ст. звесткі пра год выдання ў бібліяграфічных апісаннях дакументаў, прысвечаных беларускім рэгіёнам абазначаліся,:*

2.1. Anni:, Anno:, An:

2.2. fol:, F:, f:

2.3. Ibid., Ibidem, ibd.

2.4. Tit:, t:

*3. Бібліяграфічнае апісанне па форме "Са зместу:" прымяняецца:*

3.1.1. для раскрыцця краязнаўчага зместу дакумента, калі з назвы дакумента ён не вынікае

3.1.2. замест анатацыі

Репозиторий БГУКИ

*4. Назавіце спецыфічныя асаблівасці падрыхтоўкі анатацый для краязнаўчых дапаможнікаў*:

4.1. Дакладнае вызначэнне тэрыторыі (населенага пункта), аб якім ідзе гаворка ў першасным дакуменце.

4.2. Указанне часу, да якога адносяцца апісаныя падзеі, з'явы, факты.

4.3. Пералічэнне ўпамінаемых асоб

4.4. Канкрэтная характарыстыка дапаможнага ілюстрацыйнага матэрыялу (карт, схем, фотаздымкаў, партрэтаў, малюнкаў).

4.5. Указанне чытацкага прызначэння анатуемага дакумента.

*5. Дапоўніце структуру рэкамендацыйнай анатацыі недастаючымі кампанентамі:*

5.1. Кароткая характарыстыка творчасці аўтара.

5.2. Месца рэгіянальнай тэматыкі ў навуковай, літаратурнай, публіцыстычнай ці іншай творчасці аўтара.

5.3. Характарыстыка анатуемага твора.

5.4. Стылістычныя асаблівасці твора, выкарыстанне аўтарам рэгіянальнага маўлення.

5.5. Характарыстыка мастацка-паліграфічнага і рэдакцыйна-выдавецкага афармлення.

5.6. Мэтавае і чытацкае прызначэнне дакумента.

*6. Дапоўніце недастаючыя кампаненты анатацый на творы мастацкай літаратуры:*

6.1. літаратурны жанр (паэма, нарыс, раман, верш)

6.2. тэма, засяроджваючыся на геаграфічных, этнаграфічным і іншых аспектах адлюстравання мясцовага жыцця

6.3. ___________________________

7. Зборнікі, прысвечаныя краю, але змяшчаючыя матэрыялы на розныя тэмы:

7.1. распісваюцца і анатуюцца паартыкульна

7.2. уключаюцца ў спіс выкарыстаных крыніц, калі _______________________________.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. *Библиотечное* краеведение*:* терминолог. словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.

2. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М., 1989. – 138 – 140.

Репозиторий БГУКИ

3. *Краязнаўчая дзейнасць* бібліятэк: метад. рэкамендацыі / НБ Беларусі; склад. Р.М.Чыгірова, М.У.Прылішч; рэд. І.А.Прылішч, Р.М.Чыгірова. – Мн.:, 1994. – С. 45 – 47.

*Дадатковая*

1. *Саітава, В.І.* Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі перыяду Рэчы Паспалітай абодвух народаў аб краях Беларусі / В.І.Саітава // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў "Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 15 – 16 верасня 2000 г.). – Мн., 2002. – С.8 – 31.

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка тэстаў.

1. Субяседаванне па тэме.
2. Выступленні на семінары № 1.

## Тэма 2. МАНІТОРЫНГ ЯКАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ (на прыкладзе бібліяграфічных выданняў апошніх год), 14 гадзін

**Заданне СРС.** Кожны студэнт павінен прааналізаваць сучасныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі, выявіць асноўныя станоўчыя метадычныя характарыстыкі і недахопы. Аналізуюцца і ацэньваюцца ўсе структурныя часткі дапаможнікаў. Эталонам лічацца метадычныя патрабаванні, якія адлюстраваны ў сучасных метадычных, вучэбных, даведачных, навуковых публікацыях. Такія метадычныя патрабаванні атрыманы студэнтамі падчас выканання лабараторнай работы па тэме Маніторынг якасці краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў (па публікацыях у спецыяльным друку). Канкрэтныя метадычныя рашэнні ў аналізуемых дапаможніках суадносіцца з "эталоннымі". Неабходна зрабіць:

бібліяграфічнае апісанне аналізуемага дапаможніка

вызначыць яго від, тып, жанр

адпаведнасць "эталонным" патрабаванням:

- прадмовы, уводзінаў;
- падыходу да вызначэння тэрыторыі – аб'екта адлюстравання
- адбору дакументаў

Рэпазіторый БГУКИ

- бібліяграфічных запісаў, у т.л. анатацый
- групоўкі матэрыялу
- саставу даведачна-пошукавага апарату, якасці дапаможных паказальнікаў
- афармлення дапаможніка
- Асобна студэнт вызначае інавацыйныя метадычныя рашэнні.

**Літаратура**

*Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. – Изд. 4-е, перераб. и доп. – СПб., 2014. – С. 552 – 565.

*Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

1.

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка тэстаў.
2.Субяседаванне па тэме.
3. Выступленні на семінары № 1.
3. Выкарыстанне ведаў на практычных работах № 1 – 3.

## Тэма 3. РЭДАГАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ, 14 гадзін

**Заданне для СРС** – на аснове прапанаванай літаратуры падрыхтавацца да тэсціравання.

*1. Суаднясіце дзеянні ўдзельнікаў працэса рэдагавання краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка з відам рэдагавання:*

| | |
|---|---|
| А. Кансультатыўная дапамога па анатаванні, рэферыраванні, прадметызацыі, групоўцы матэрыялу | 1) Навуковае рэдагаванне |
| Б. Праверка сінтаксісу | 2) Бібліяграфічнае рэдагаванне |
| В. Праверка правільнасці, паслядоўнасці і аднастайнасці бібліяграфічных запісаў | 3) Літаратурнае рэдагаванне |

*2. Тыповыя памылкі, дапушчаныя пры падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў з іх выдаленнем у працэсе рэдагавання:*

Репозиторий БГУКИ

| | |
|---|---|
| А. Неадпаведнасць назваў рубрык “Зместу” і раздзелаў асноўнага тэксту бібліяграфічнага дапаможніка | 1) Літаратурнае рэдагаванне |
| Б. Паўтор у прадмове звестак, якія паўтараюць загаловак і падзагаловачныя элементы паказальніка | 2) Навуковае рэдагаванне |
| В. Неадпаведнасць стылю тэкставых матэрыялаў паказальніка яго мэтаваму і чытацкаму прызначэнню | 3) Бібліяграфічнае рэдагаванне |

*3. Навуковае рэдаванне КБД вядуць:*

3.1.Мясцовыя спецыялісты

3.2.Краязнаўцы

3.3.Бібліятэкары аддзелаў абслугоўвання

*4. У працэсе навуковага рэдагавання КБД аналізуюць і высвятляюць:*

4.1.Адпаведнасць праспекта дапаможніка яго тэксту

4.2.Стылістычныя недахопы

4.3.Прынцыпы адбору дакументаў

4.4.Прынцыпы групоўкі бібліяграфічных запісаў

4.5.Моўныя памылкі

4.6.Склад і якасць даведачна-метадычнага апарата

*5. У працэсе літаратурнага рэдагавання высвятляюць і выпраўляюць:*

5.1.Стылістычныя недахопы

5.2.Адпаведнасць бібліяграфічных запісаў дзеючым правілам і стандартам

5.3.Моўныя памылкі

5.4.Паўторы

5.5.Дакладнасць спасылак ад дапаможных паказальнікаў да асноўнага тэксту

*6. У працэсе бібліяграфічнагарэдагавання высвятляюць і выпраўляюць:*

6.1.Парушэнні уніфікаванага падыходу да афармлення БЗ

6.2. Памылкі ў групоўцы БЗ

6.3. Моўныя памылкі

6.4. Правільнасць нумарацыі БЗ

6.5.Пропускі дакументаў у спісах прагледжаных крыніц

*7. Моўна-стылістычныя патрабаванні да краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў і жанраў:*

Репозиторий БГУКИ

7.1. Адрозніваюцца

7.2. Застаюцца нязменнымі

*8. Патрабаванні да паўнаты бібліяграфічнага апісання дакументаў у папулярных і навукова-дапаможных КБД:*

8.1. Аднолькавыя

8.2. Магчыма скарачэнне некаторых элементаў у бібліяграфічных апісаннях дакументаў у …. дапаможніках.

*ЛІТАРАТУРА*


1. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М.: Книга, 1989. – С.145 – 148.


**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка тэстаў.

2. Субяседаванне па тэме.

3. Выкарыстанне ведаў на практычных работах № 1 – 2.

## Тэма 4. ПАДРЫХТОЎКА ПРАСПЕКТА АГУЛЬНАГА КРАЯЗНАЎЧЫХ РЭКАМЕНДАЦЫЙНАГА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ДАПАМОЖНІКА, 14 гадзін

**Заданне для СРС –** падрыхтаваць праспект агульнага краязнаўчага рэкамендацыйнага бібліяграфічнага паказальніка. Кожны студэнт павінен адлюстраваць мадэль будучага паказальніка ў праспекце: актуальнасць тэмы, тэрытарыяльныя межы края, крыніцы выяўлення дакументаў (бібліяграфічныя і першасныя дакументальныя), крытэрыі адбора дакументаў, спосабы бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў, структуру анатацый, структуру паказальніка, віды бібліяграфічных груповак у раздзелах, склад дапаможных паказальнікаў і інш.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М., 1989. – 134 – 147.
2. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.


**Форма кантролю**

1. Праверка і абмеркаванне праспекта.
2. Выступленні на семінары № 2.
3. Выкарыстанне на практычнай рабоце № 1.

Репозиторий БГУКИ

## Тэма 5. АНАЛІЗ ЯКАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ, 14 гадзін

**Заданне для СРС.** 1. Студэнты знаёмяцца з ацэнкамі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, іх методыкай на аснове новых публікацый у спецыяльным перыядычным друку, зборніках і іншых выданнях. Выяўляюць усе характарыстыкі, якія датычаць:

- ✓ мэтавага і чытацкага прызначэння;
- ✓ віда, жанра (тыпа);
- ✓ крыніц выяўлення дакументаў;
- ✓ крытэрыяў адбору, групоўкі дакументаў;
- ✓ бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў;
- ✓ асаблівасцей даведачна-пошукавага апарату і інш.

2. Кожны студэнт павінен прааналізаваць сучасныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі (8 розных відаў і жанраў, каб 312), выявіць асноўныя станоўчыя метадычныя характарыстыкі і недахопы. Аналізуюцца і ацэньваюцца ўсе структурныя часткі дапаможнікаў. Эталонам лічацца метадычныя патрабаванні, якія адлюстраваны ў сучасных метадычных, вучэбных, даведачных, навуковых публікацыях (заданне 1). Канкрэтныя метадычныя рашэнні ў аналізуемых дапаможніках суадносіцца з “эталоннымі”. Неабходна выканаць:

- ✓ бібліяграфічнае апісанне аналізуемага дапаможніка
- ✓ вызначыць яго від, тып, жанр
- ✓ адпаведнасць “эталонным” патрабаванням:
  - o прадмовы, уводзінаў;
  - o падыходу да вызначэння тэрыторыі – аб’екта адлюстравання
  - o адбору дакументаў
  - o бібліяграфічных запісаў, у т.л. анатацый
  - o групоўкі матэрыялу
  - o складу даведачна-пошукавага апарату, якасці дапаможных паказальнікаў
  - o афармлення дапаможніка.
  - o Асобна студэнт вызначае інавацыйныя метадычныя рашэнні.

### *ЛІТАРАТУРА*

1. *Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. –4-е изд., перераб. и доп. – СПб., 2014. – С. 552 – 565
2. *Пушкін, І.* "Выпускнікі і навучэнцы Магілёўскай мужчынскай гімназіі": паказальнік літ. / І.Пушкін // Магілёўс. ведамасці. – 8 ліп. – С.4.

**Форма кантролю СРС:** 1.Субяседаванне па тэме.

Рэпазіторый БГУКИ

## Тэма 6. ЭЛЕКТРОННЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ Ў ІНТЭРНЕТ, 14 гадзін

**Заданне для СРС. В**ывучыць метадычныя асаблівасци электронных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Кожны студэнт павінен азнаёміцца з выданнямі двух-трох абласных бібліятэк Беларусі і адной – Расіі.

1. Па web-сайтах абласных бібліятэк Беларусі кожны студэнт павінен: 1) устанавіць шлях доступу да ЭКБД (магчымы уваход праз раздзел "Краязнаўства", "Структура бібліятэкі", старонку "Нашы выданні" і інш.), ацаніць яго зручнасць і прастату.

2. Азнаёміцца з прадстаўленымі электроннымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі:

2.1. Электронныя версіі друкаваных выданняў: назва, від, тып, жанр, прынцыпы адбору дакументаў, структура, доступ, пошук. Асобна звяртаецца ўвага на частату ўзнаўляемасці, калі гэта перыядычнае выданне. Ці выкарыстоўваюцца сродкі навігацыі па тэкстах гэтых бібліяграфічных дапаможнікаў?

2.2. Электронныя бібліяграфічныя выданні: назва, від, тып, жанр, прынцыпы адбору дакументаў, структура, доступ, пошук. Ахарактарызаваць магчымасці пошуку па зместу і па дапаможных паказальніках.

2.3. Высновы аб перавагах і недахопах прааналізаваных дапаможнікаў.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

2. *Толкунова, В.* Современные библиографические краеведческие издания как средство обеспечения доступа к краеведческой информации / В. Толкунова // Инф. бюл. РБА. – 2003. – № 24. – С. 176 – 178.


**Форма кантролю**

1. Праверка пісьмовых работ. Субяседаванне

Рэпазіторый БГУКИ

# ГРАФІК КАНТРОЛЮ ЗА САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ СТУДЭНТАЎ

| № п\п | Тэмы для кантролю па СРС | Форма кантролю | Знаходжанне метадычных матэрыялаў | Тэрмін кантролю | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | № тыд-ня | Месяц |
| 1 | Аб’екты бібліяграфавання, асаблівасці бібліяграфічнага апісання і анатавання краязнаўчых дакументаў | Праверка тэстаў, субяседаванне, выступленні на семінары № 1 | Вучэбна-метадычны комплекс, 312 каб. Электронная бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў | 3 | люты |
| 2 | Маніторынг якасці краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | Праверка тэстаў, субяседаванне, Выступленні на семінары 1, Выкарыстанне на практычных работах № 1 – 2 | Там жа | 4 | люты |
| 3 | Рэдагаванне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | Праверка тэстаў, Субяседаванне, Выкарыстанне ведаў на практычных работах № 1-2. | Там жа | 5 | сакавік |
| 4 | Падрыхтоўка праспекта агульнага краязнаўчых рэкамендацыйнага бібліяграфічнага дапаможніка | Праверка і абмеркаванне праспектаў, выступленні на семінары № 2, выкарыстанне на практычнай рабоце № 1 | Там жа | 6 | сакавік |
| 5 | Аналіз якасці краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | Субяседаванне па тэме, Выступленні на семінарах № 2. | Там жа | 7 | сакавік |
| 6 | Электронныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі ў Інтэрнет | Праверка пісьмовых работ | Там жа | 9 | красавік |

Репозиторий БГУКИ

## УМОВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ

### Ранжыраванне відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне

1. Наведванне лекцый – *2 балы.*

(7 лекцый х 2 бала =14 балаў)

2. Наведванне семінарскіх заняткаў – *2 балы.*

(2 семінары х 2бала = 4 балаў)

3. Адказ на семінарскіх занятках – *10 балаў.*

(2 семінары х 10 балаў = 20 балаў)

4. СРС – форма кантроля: пісьмовая работа, субяседаванне, выступленне на семінары – *10 балаў.*

(5 работ х 10 балаў = 50 балаў)

5. Наведванне практычных заняткаў – *2 балы.*

6. Выкананне практычных работ – да 10 балаў.

(2 завершаных бібліяграфічных дапаможніка х 10 балаў = 20 балаў)

**Прэміяльныя балы**

1. Актыўнасць на семінарскіх занятках – *6 балаў.*
2. Аналіз манаграфічных крыніц і артыкулаў з выступленнем перад групай – *10 балаў.*

**Памяншальныя балы**

1. Несвоечасовае (без уважлівай прычыны) выкананне заданняў па курсу – *мінус 2 балы*.
2. Адпрацоўка раней непадрыхтаванага семінара, практычнай работы па курсу – *мінус 5 балаў.*

Репозиторий БГУКИ

# ТЭМЫ КУРСАВЫХ РАБОТ

1. Бібліяграфічная прадукцыя краеведческого музея: спецыфіка і выкарыстанне
2. Дзейнасць … бібліятэкі па падрыхтоўцы краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.
3. Краязнаўчая бібліяграфічная прадукцыя для дзяцей у структуры інфармацыйных рэсурсаў грамадства.
4. Краязнаўчая літаратурная бібліяграфія ў сістэме рэгіянальнай бібліяграфічнай інфармацыі.
5. Краязнаўчыя інфармацыйныя патрэбнасці музейных работнікаў рэгіёна.
6. Падрыхтоўка краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка па выбранай тэме.
7. Сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў …. бібліятэкі.
8. Электронныя краязнаўчыя дапаможнікі: тэхналагічны аспект.
9. Тэхналогія падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных баз даных.

Репозиторий БГУКИ

## ТЭМЫ ДЫПЛОМНЫХ І МАГІСТАРСКІХ РАБОТ

1. Сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў на сучасным этапе: тэарэтыка-метадалагічныя і арганізацыйныя пытанні.
2. Фактаграфічныя краязнаўчыя рэсурсы: метадычныя і тэхналагічныя пытанні.
3. Генерыраванне і выкарыстанне бібліяграфічных краязнаўчых баз даных: метадычныя і тэхналагічныя пытанні.
4. Камунікатыўны характар краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.
5. Стварэнне карпаратыўных бібліяграфічных рэсурсаў як тэндэнцыя сучаснага бібліятэчнага краязнаўства.

Репозиторий БГУКИ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Загадчык кафедры
тэорыі і гісторыі ІДК
____________ Касап В.А.

____ __________ 2015 г.

**Пералік тэарэтычных пытанняў** да экзамену па вучэбнай дысцыпліне "Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў"

1. Абгрунтаванне выбару дапаможных паказальнікаў для краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў; методыка складання геаграфічнага і персанальнага дапаможных паказальнікаў.
2. Агульныя асаблівасці анатавання краязнаўчых дакументаў.
3. Анатаванне літаратурна-мастацкіх твораў, крытычных матэрыялаў і дзіцячай літаратуры ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.
4. Асаблівасці адбору дакументаў па тэрытарыяльнай прымеце ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.
5. Асаблівасці анатавання навукова-папулярных і вучэбных выданняў у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.
6. Асаблівасці анатавання навуковых і даведачных выданняў, мемуарнай літаратуры у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.
7. Бібліяграфічны характар электронных краязнаўчых выставак.
8. Віды груповак бібліяграфічных запісаў у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках рознага мэтавага і карыстальніцкага прызначэння.
9. Віды рэдагавання краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Спецыфіка навуковага рэдагавання.
10. Віды, тыпы і жанры краязнаўчых дапаможнікаў. Агульная характарыстыка.
11. Газетныя матэрыялы як аб'ект адлюстравання ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.
12. Дакументальныя аб'екты бібліяграфавання ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках: агульная характарыстыка.
13. Крыніцы выяўлення дакументаў для краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
14. Метадычныя асаблівасці "малых формаў" краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
15. Метадычныя асаблівасці бягучых навукова-дапаможных паказальнікаў тыпу "Новая літаратура аб вобласці" (раёне, горадзе): традыцыйныя і электронныя формы.
16. Метадычныя асаблівасці галіновых і тэматычных навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
17. Метадычныя асаблівасці зводных паказальнікаў краязнаўчай літаратуры.
18. Метадычныя асаблівасці календароў знамянальных і памятных дат і бібліяграфічных хронік: традыцыйныя і электронныя формы..

Репозиторий БГУКИ

19.Метадычныя асаблівасці краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў тыпу “Літаратурнае жыццё края”: традыцыйныя и электронныя формы.
20.Метадычныя асаблівасці краязнаўчых бібліяграфічных нарысаў.
21.Метадычныя асаблівасці краязнаўчых дайджэстаў.
22.Метадычныя асаблівасці паказальнікаў зместу краязнаўчай перыёдыкі.
23.Метадычныя асаблівасці паказальнікаў мясцовага друку.
24.Метадычныя асаблівасці папулярных краязнаўчых бібліяграфічных энцыклапедый і анталогій: традыцыйныя і электронныя формы.
25.Метадычныя асаблівасці персанальных/біябібліяграфічных краязнаўчых бібліяграфічных паказальнікаў: традыцыйныя и электронныя формы.
26.Метадычныя асаблівасці краязнаўчых біябібліяграфічных слоўнікаў.
27.Метадычныя асаблівасці рэкамендацыйных бібліяграфічных паказальнікаў тыпу “Што чытаць аб краі”.
28.Тэхналогія краязнаўчых камбініраваных баз даных.
29.Характарыстыка даведачна-метадычнага апарату ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках розных відаў, тыпаў і жанраў.
30. Метадычныя асаблівасці краязнаўчых бібліяграфічных аглядаў.
31. Тэхналогія электронных зводных краязнаўчых каталогаў.
32. Асаблівасці падрыхтоўкі вэбліяграфічнага краязнаўчага дапаможніка.
33.Бібліяграфаванне мемаратаў.
34. “Літаратурныя карты” рэгіёна і іх бібліяграфічнае аснашчэнне.
35. Камплексіраванне бібліяграфічнай, фактаграфічнай і поўнатэкставай інфармацыі ў сучасных краязнаўчых інфармацыйных прадуктах.
36. Краязнаўчыя бібліяграфічныя базы даных: тэхналогія ў айчынных бібліятэках.
37. Бібліяграфічны характар краязнаўчых баз даных.
38. Метадычныя асаблівасці пуцевадзіцелей па краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах.
39. Зводныя каталогі краязначых і мясцовых дакументаў: традыцыйныя і электронныя формы.
40. Тэхналогія мульцімедыйныя рэсурсаў да юбілеяў выдатных падзей і асоб у краі.

Выкладчык
_______________В.І. Саітава

Разгледжаны на пасяджэнні
кафедры
тэорыі і гісторыі ІДК
пратакол №_____ад ____
__________2015 г.

Репозиторий БГУКИ

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭХНІЧНЫХ СРОДКАЎ

У мэтах паляпшэння нагляднасці лекцыйнага матэрыялу выкарыстоўваюцца электронныя прэзентацыі ў праграме Power Point па тэмах:

1. Асаблівасці тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

2. Метадычныя асаблівасці рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

3. Метадычныя асаблівасці навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Репозиторий БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ФЗН

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДА ЛАБАРАТОРНЫХ І ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА

### па тэме “АНАЛІЗ ЯКАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ”, 2 гадзіны

**Заданне.** Кожны студэнт павінен прааналізаваць краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі (8 розных відаў і жанраў, каб. 312), выявіць асноўныя станоўчыя метадычныя характарыстыкі і недахопы. Аналізуюцца і ацэньваюцца ўсе структурныя часткі дапаможнікаў. Неабходна выканаць:

1. бібліяграфічнае апісанне аналізуемага дапаможніка
2. вызначыць яго від, тып, жанр
3. адпаведнасць патрабаванням:
   - прадмовы, уводзінаў;
   - падыходу да вызначэння тэрыторыі – аб’екта адлюстравання
   - адбору дакументаў
   - бібліяграфічных запісаў, у т.л. анатацый
   - групоўкі матэрыялу
   - складу даведачна-пошукавага апарату, якасці дапаможных паказальнікаў.
4. ацаніць афармленне дапаможніка.
5. асобна вызначаюцца інавацыйныя метадычныя рашэнні.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. –2-е изд., перераб. и доп. – СПб., 2003. – С.420 – 431.
2. *Пушкін, І.* "Выпускнікі і навучэнцы Магілёўскай мужчынскай гімназіі": паказальнік літ. / І.Пушкін // Магілёўс. ведамасці. – 8 ліп. – С.4.

Репозиторий БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА
## па тэме “БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ХАРАКТАР ВІРТУАЛЬНЫХ ВЫСТАВАК”, 4 гадзіны

**Заданне:** студэнты знаёмяцца з віртуальнымі выстаўкамі Віцебскай АБ, Магілёўскай АБ і выяўляюць іх бібліяграфічнае аснашчэнне. Кожны павінен выканаць характарыстыку тэматычнай і персанальнай выставы краязнаўчага зместу.

На галоўнай старонцы сайта Магілёўскай АБ трэба раскрыць раздзел “Віртуальныя выстаўкі”:

1. адзначыць зручнасць доступа (пераліку) выставак; прагледзець назвы выставак, запісаць у сшытак тыя з іх, якія, на думку студэнтаў, носяць краязнаўчы характар.

2. Для разгорнутага аналізу выбраць дзве: “Магілёўшчына ў гады Першай сусветнай вайны” і “Паэт слова” (да 90-годдзя з дня нараджэння А.В. Пысіна),

3. пазнаёміцца з сэрвісам Calaméo (выкарыстоўвае Магілёўская АБ), прызначаным для імгненнага стварэння інтэрактыўных публікацый у Інтэрнеце. Раскрыць яго шырокія магчымасці для адлюстравання разнастайных матэрыялаў, прадстаўленых на выстаўках.

3. Характарыстыка віртуальнай выставы:

- назва выстаўкі, якім аструктурным падраздзяленнем бібліятэкі яна падрыхтавана і яе жанр/від (тэматычная, персанальная і інш.);

- актуальнасць тэмы выстаўкі і яе мэтавае і карыстальніцкае прызначэнне. Ці маецца ўступ (прадмова) да выстаўкі і якія звесткі ў ім змешчаны;

- структура выстаўкі (колькасць слайдаў (калі яны ёсць), раздзелаў, назвы асноўных раздзелаў. Зрабіць выснову аб разнапланавасці раскрыцця тэмы, паслядоўнасці і лагічнасці яе раскрыцця;

- якія дакументы экспануюцца? Ці ёсць бібліяграфічныя спасылкі да інтэрнет-рэсурсаў, АВ-дакументаў і інш. Раскрыйце магчымасці выстаўкі ў публікацыі Calaméo для карыстальніка: праглядаць дакументы, чытаць іх і інш.;

- якія формы бібліяграфічных матэрыялаў прадстаўлены на выстаўцы? Пералічыце і ацаніце віды (тыпы, жанры) прапанаваных бібліяграфічных рэсурсаў (бібліяграфічныя апісанні кніг і іншых дакументаў з анатацыямі, бібліяграфічныя спісы, паказальнікі і інш.), якасць бібліяграфічных запісаў. Наколькі бібліяграфічныя матэрыялы садзейнічаюць раскрыццю зместа

Рэпозиторий БГУКИ

выстаўкі, устанаўленню сувязей экспануемых рэсурсаў, прыцягненню ўвагі карыстальнікаў;

- ахарактарызуйце мастацкае афармленне выстаўкі (яе дызайн).
- заўважаныя недахопы і пажаданні.

4. Параўнаць выкарыстаную методыку і тэхналогію віртуальных выставак і прадстаўлення бібліяграфічных матэрыялаў і іх якасці Магілёўскай і Віцебскай АБ.

Вынікі аналізу абмяркоўваюцца ў аўдыторыі.

Репозиторий БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА
## па тэме “АНАЛІЗ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АСНАШЧЭННЯ ЛІТАРАТУРНЫХ КАРТ”, 4 гадзіны

### Характарыстыка літаратурных карт

1. Назва бібліятэкі-стваральніцы і рэсурса тыпа “літаратурная карта”.
2. Размяшчэнне на сайце бібліятэкі, зручнасць доступа.
3. Яснасць і дастатковая паўната апісання рэсурса (прадмова, уступ, аб праекце і т.п.), звесткі аб крыніцах інфармацыі, прадстаўленых у рэсурсе.
4. Структура рэсурса (галоўныя раздзелы, пошукавыя інструменты). Падрабязная характарыстыка пошукавых магчымасцей.
5. Структура фактаграфічных запісаў (аднаўзроўневыя, двухузроўневыя, шматузроўневыя).
6. Семантычны аналіз 2-3-х фактаграфічных запісаў, у т.л. 1-й біяграфічнай даведкі пісьменніка, даведкі тыпу “памятныя мясціны”, “літаратурныя прэміі” ці іншых.
7. Прадстаўленне бібліяграфічных матэрыялаў (асобных запісаў, спісаў, паказальнікаў і інш.; метады бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў).
8. Функцыянальнасць рэсурса (магчымасці пошука па розных прыметах, у т.л. шляхам вольнай камбінацыі ключавых слоў).
9. Дызайн рэсурса, мультымедыйны характар, ілюстрацыйнае афармленне.

### Пералік адрасоў літаратурных карт

1. Тамбовская областная универсальная научная библиотека http://www.tambovlib.ru/
«Литературная карта».
2. Курская областная универсальная научная библиотека
http://www.onb.kursk.ru/
3. Алтайская краевая универсальная научная библиотека
http://www.akunb.altlib.ru/
4. Холмогорская районная библиотека им. М.В. Ломоносова (Россия)
http://holmzbs.moy.su/index/literaturnaja_karta/0-9
5. Липецкая областная универсальная научная библиотека
(http://library.lipetsk.ru/lipmap/?view=featured)
Литературная карта Липецкой области
6. Костромская областная универсальная научная библиотека
http://www.kostroma.net/~kounb/readers/method/method_lmap.html
Литературная карта
7. Ульяновская областная научная библиотека
Литературная карта Ульяновской области
8. Иркутская областная научная библиотека
Литературная карта Иркутской области.
9. Централизованная городская библиотечная система , г. Тюмень
Литературная карта (раздел “Краеведение”, подраздел “Тюмень литературная”)
http://www.citylib-tyumen.ru/tyumen/kraeved

Репозиторий БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА па тэме “ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВА-ДАПАМОЖНАГА БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНАГА СЛОЎНІКА”, 6 гадзін

*Мэта:* Авалоданне методыкай падрыхтоўкі персанальных паказальнікаў ураджэнцаў і дзеячоў края.

*Выкананне:* Кожны студэнт рыхтуе дапаможнік па вызначанаму краю (населенаму пункту). Выбар тэрыторыі ўзгадняецца з выкладчыкам. Распрацоўваецца праспект будучага дапаможніка, у якім вызначаюцца крыніцы і крытэрыі выяўлення і адбора персаналій, крыніцы выяўлення матэрыялаў аб іх. Складаюцца ўніфікаваныя мадэлі персанальных глаў, якія будуць выкарыстаны ў слоўніку. Абгрунтоўваюцца крытэрыі адбору дакументаў і групоўкі бібліяграфічных запісаў, якія падначалены мэтам магчыма поўнага адлюстравання сувязей “асоба – край”. Мінімальная колькасць персаналій –10, павінны быць прадстаўлены як ураджэнцы, так і дзеячы края. Персаналіі могуць быць абмежаваныя храналагічным перыядам, родам дзейнасці, саслоўнай прыналежнасцю ці інш. Рыхтуюцца элементы даведачна-метадычнага аснашчэння паказальніка, ілюстрацыйныя матэрыялы.

Для падрыхтоўкі дапаможніка выкарыстоўваецца праграмнае забеспячэнне камп’ютарных класаў.

Репозиторий БГУКИ

### *ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М. : Кн. палата, 1989. – С.96 – 101, 127– 128.
2. *Михлина, И.И.* Отбор литературы по территориальному признаку в краеведческих пособиях / И.И. Михлина // Библиография. – 1998. – № 1. – С.35 – 39.
3. *Подготовка* краеведческих материалов по персоналиям: метод. рекомендации / Рос. гос. б-ка для слепых; сост. Н.Д. Шапошникова. – М., 2001. – 14 с.
4. *Саітава, В.І.* Персанальная краязнаўчая бібліяграфія / В.І.Саітава // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С.122 – 128.
5. *Саітава, В.І.* Фотадакументы як аб’ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В.І.Саітава // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск. 24 – 26

мая 2005 г.): матэрыялы чытанняў. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – С.121 – 127.
6. *Соболева, А.* Персональный указатель: теория и методика / А.Соболева // Мир библиогр. – 2001. – № 4. – С.23 – 26.
7. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

Репозиторий БГУКИ

Репозиторий БГУКИ